УДК 329.7:28]:[316.4+316.7](476)

# ДЗЕЙНАСЦЬ МУСУЛЬМАНСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ ЯК ІНСТРУМЕНТ ІНТЭГРАЦЫІ НОСЬБІТАЎ ІСЛАМСКАЙ КУЛЬТУРНАЙ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

**Татарэвіч Марына Аляксандраўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (г. Мінск, Беларусь)

*У дадзеным артыкуле дзейнасць мусульманскіх аб'яднанняў Рэспублікі Беларусь разглядаецца як адзін з дамінатных фактараў іх культурнай інтэграцыі.*

Сучасны свет характарызуецца тэндэнцыямі да павелічэння этнічных кантактаў, размывання культурных межаў. Палітычная ўстойлівасць і функцыянальнасць дэмакратычнай дзяржавы будуецца на аб'яднанні людзей розных рэлігій і культур, на фарміраванні грамадзянскай ідэнтычнасці. Рэспубліка Беларусь з'яўляецца шматнацыянальнай дзяржавай. Гісторыя ўзаемаадносін паміж народамі, якія насяляюць беларускія землі, мае шматгадовы вопыт сумеснага пражывання, што прывяло да ўзаемапранікнення культурных традыцый. У сувязі з гэтым вялікае значэнне набывае сістэмнае вывучэнне культурнай інтэграцыі мусульман у сацыякульную прастору Беларусі. Айчынная гуманітарыстыка ўнесла значны ўклад у вывучэнне працэсаў фарміравання нацыянальных культурных каштоўнасцяў і ідэалаў, сцвярджаецца ўнікальнасць сумарнага культурнага здабытку шматнацыянальнай дзяржавы.

Па выніках перапісу насельніцтва 2009 года іслам у краіне, магчыма, вызнаюць каля 30 000 чалавек (татары (7316), азербайджанцы (5567), туркмены (2685), узбекі (1 593), казахі (1355), башкіры (607), таджыкі (871), туркі (469), афганцы (429), чачэнцы (265), аварцы (149), абхазы (98), кыргызы (95), даргінцы (88) і інш.) [1]. Многія мусульмане ўваходдзяць у склад абшчын і актыўна ўдзелічаюць у іх сацыякультурнай дзейнасці. Па дадзеных прадстаўленым на сайце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў на 1 студзеня 2019 года ў Рэспубліцы Беларусь афіцыйна зарэгістраваныя мусульманскія абшчыны ў наступных рэгіёнах: Брэсцкая вобласць – 2, Віцебская вобласць – 4, Гомельская вобласць – 1, Гродзенская вобласць – 7, Магілёўская вобласць – 1, Мінская вобласць – 6, г. Мінск – 3 [3].Усяго на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь налічваецца 24 абшчыны, якія вызнаюць іслам.

У нашым дасдеванні абшчыны разглядаюцца як інструмент адаптацыі і інтэграцыі носьбітаў ісламскай культурнай традыцыі. Амаль усе абшчыны ўваходзяць у склад Рэспубліканскіх рэлігійных об'яднанняў. Дзякуючы дзейнасці гэтых структур у мусульман абуджаецца самасвядомасць, якая выяўляецца ў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

імкненні адрадзіць сваю культуру. Непасрэднымі арганізатарамі і праваднікамі гэтых складаных працэсаў становяцца нацыянальна-культурныя цэнтры, аб’яднанні, якія ствараюцца дыяспарамі мусульманскіх этнасаў а таксама асобамі, зацікаўленымі ў рэалізацыі названых вышэй мэтаў. Даследаванне ролі мусульманскіх абшчын у рэгіянальных міжнацыянальных адносінах заканамерна і неабходна, так як яны ўсё ў большай меры становяцца паўнапраўнымі ўдзельнікамі ўсяго комплексу палітычных, эканамічных і сацыякультурных адносін і адкрыта заяўляюць пра свае інтарэсы.

Даследванне фіксуе ўзмацнелы працэс структуравання і самаарганізацыі абшчын у рэлігійныя аб’яднанні для адстойвання сваіх інтарэсаў. Аб’яднання выстрайваюцца ў сістэмы з трывалымі гарызантальнымі і вертыкальнымі сувязямі. Структураванне мусульман можна ўмоўна прадставіць наступным чынам: этнічная група – абшчына – рэлігійнае аб’яднанне. Іншымі словамі, усведамленне этнічнай групай сваіх інтарэсаў перакладае яе на ўзровень абшчыны як этнакультурнай цэласнасці, а ўжо пэўная арганізацыйная сталасць апошняй спрыяе стварэнню рэлігійных аб’яднанняў рознага тыпу.

Рэлігійныя аб’яднанні спрыяюць задавальненню спецыфічных інтарэсаў і запытаў кожнага мусульманіна і яго нацыянальнай групы, сцвярджэнню ў міжнацыянальных зносінах узаемнай павагі, устанаўленню і падтрыманню культурных сувязяў з нацыянальна-дзяржаўнымі ўтварэннямі ў Рэспубліцы Беларусь і роднаснымі нацыянальнымі групамі за мяжой. Натуральна, што задавальненне нацыянальных запытаў грамадзян мусульманскага веравызнання не павінна наносіць шкоды правам і законным інтарэсам тых нацыянальных супольнасцяў, сярод якіх яны пражываюць.

Прааналізіраваўшы дзейнасць рэлігійных аб’яднанняў мусульман можна вызначыць асноўныя мэты і напрамкі іх дзейнасці: захаванне і развіццё культуры і рэлігіі мусульман; захаванне рэлігійных традыцый; падтрымка і абарона інтарэсаў прадстаўнікоў мусульманскіх абшчын; развіццё супрацоўніцтва з іншымі рэлігійнымі аб’яднаннямі і нацыянальна-культурнымі аўтаноміямі; захаванне мусульманскіх сямейных каштоўнасцяў; праца з моладдзю па выхаванню талерантнасці.

Дзейнасць муслыманскіх абшчын і рэлігійных аб’яднанняў ажыццяўляецца ў асноўным у наступных формах: этнакультурныя мерапрыемствы, праекты, семінары; публікацыі ў СМІ; стварэнне ўласных сайтаў, груп у сацыяльных сетках; вывучэнне арабскай мовы; сустрэчы з прадстаўнікамі абшчын; рэгулярныя заняткі па вывучэнню асноў ісламa; удзел у дзейнасці абшчыны; моладзевыя лагеры для хлопчыкаў і дзяўчат на базе мячэцей Мінска і Іўя [2].

Мусульманскія аб’яднанні змаглі арганізаваць сістэматычную працу па вывучэнні сваёй культуры, а таксама яе прэзентацыі ў рамках маштабных этнакультурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на рэгіянальным, абласным і рэспубліканскім узроўнях. Вынікам шматграннай дзейнасці аб’яднанняў з’яўляецца значны ўклад ва ўмацаванне этнакультурнага адзінства мусульманскіх народаў, далейшае іх культурна-грамадскае развіццё. Дзейнасць аб’яднанняў аказвае вельмі значны ўплыў на асяроддзе мусульман. Часта суайчыннікі з’яўляюцца для мусульман галоўным колам зносінаў, а традыцыйны калектывізм усходніх народаў варта разглядаць як фактар, які дапамагае мусульманам не



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

растварыцца ў беларускім грамадстве. Неабходна адзначыць і ролю традыцыйнага калектывізму ўсходніх народаў у захаванні мусульманскай ідэнтычнасці ў беларускім грамадстве.

Такім чынам, нацыянальна-культурныя аб'яднанні з'яўляюцца важным сродкам выяўлення і задавальнення этнакультурных запытаў носьбітаў ісламскай культурнай традыцыі, дасягнення міжнацыянальнай стабільнасці, папярэджання канфліктаў у шматнацыянальным грамадстве.

## Літаратура

1. Перепись населения 2009 : стат. зборник: в 3 т. / Нац. стат. ком-т Респ. Беларусь; редкол. : В.И. Зиновский (пред.) [и др.]. – Мн. : РУП «Информационно-вычислительный центр Национального статистического комитета Республики Беларусь», 2011. – Т. III: Национальный состав населения Республики Беларусь. – 433 с.

2. Республиканское Религиозное Объединение “Мусульманское Религиозное Объединение в Республике Беларусь” [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.mechet.by/post/детский-лагерь-1. – Дата доступа: 26.02.2020.

3. Религиозные общины в Республике Беларусь // Упалнамоченный по делам религий и национальностей (официальный сайт) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://belarus21.by/Articles/kolichestvo-religioznyh-obshhin-v-respublike-belarus-na-1-yanvarya-2019-g. – Дата доступа: 26.02.2020.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова